



# ДА 50-ГОДДЗЯ АЛІНЫ ЭДМУНДАЎНЫ САБУЦЬ

**Дарагая Аліна Эдмундаўна!**

Дзень Вашага юбілею стаў для нас, Вашых калегаў па пісьменніцкай арганізацыі падставай у чарговы раз усвядоміць тое, як многа Вы значыце для калектыва. У Вашай шматграннай асобе амплуа педагога, вучонага, літаратара арганічна спалучаюцца з вобразамі чуллівай матулі, прывабнай, эфектнай жанчыны без узросту, ветлівага, абаяльнага чалавека, вернага сябра, сапраўднага аднадумца. Не можа не выклікаць захаплення тое, з якой элегантнасцю Вы крочыце па жыцці, паспяваючы старанна падтрымліваць цяпло хатняга ачага і рухаць наперад навуку, займацца творчасцю і развіваць грамадскую думку. Таму побач з Вамі ўсе мужчыны імкнуцца выглядаць страйней і маладзей, а жанчыны бяруць прыклад з Вашай арыстакратычнай вытанчанасці. Няхай ніколі не губляе цікавасці, змястоўнасці сімвалічная кніга Вашага жыцця, а кожная яе старонка нясе Вам толькі святло, цяплыню і маральны камфорт. Жадаем Вам здароўя і шчасця, гармоніі і дабрабыту, здзяйснення ўсіх планаў, мноства яркіх адкрыццяў, новых таленавітых твораў і добрых сяброў. З ЮБІЛЕЕМ!



**Калектыў
Гродзенскага абласнога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі**

*16 мая 2019 года*